Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакції і адміністрації: **Вільня, Віленская вул., № 29**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес—25 к. За граніцэй: на 1 г—4 р на 6 мес—2 р 3 мес.—1 р. Пер мена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнції, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць проз вішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакції. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад

Год IX. 13 Лютаго 1914 г. № 7

## Кругаварот.

Як ужо ведама нашым чытачом, апошнімі часамі сталіся вялікіе перамены у правіцельстве: прадседацель (старшына міністроў) міністр фінансоў Коковцэв падаўся у адстаўку, а на яго мейсцо назначэны прадседацелем рады міністроў—Горэмыкін і міністрам фінансоў Барк Да таго выйшоў ешчэ і Высочайшы рэскрыпт міністру Барку каторы кажэ, што дагэтуль дабрабыт гасударства апіраўся на руіне селянства, а цяпер трэба, каб дабрабыт гасударства апіраўся на дабрабыце селянства І як зазвычай бывае, паадзінокіе людзі і газэты немала нагаварылі аб спадзеваных лепшых парадках і лепшым жыцьці у гасударстве. Але у гэтым гомане чуваць было і галасы няверы, каторай навучыло цьвёрдае, безпраўнае грамадзянскае жыцьцё расейскае «Маскоўскіе Ведамасці» проста сказалі што «у Расеі німа парлямэнтарызму, німа такжэ і конституції». І гэта праўда наводзіць сумные думкі аб тым, што дзе німа абароны правоў чэлавека (конституції) там ня можэ быць і здароваго жыцьця, правільнаго палітычнаго і экономічнаго развіцьця.

Гэтак, побач с пераменамі у правіцельстве адбыўся зьезд націоналістоў, на каторым урадзілі каб правіцельство цьвёрда праводзіло на акраінах абрусіцельную палітыку, а найбольшую надзею націоналісты пакладаюць на міністэрства асьветы, што яно зверне увагу на адраджаючыеся народы, на гэты, як націоналісты сказалі, „проці культурны рух“(!). Датаго ж праектуюць і перамену у аснаўных законах. Ці будзе гэта перамена, ці не, невядома, вядома толькі, што народнае прэдстаўніцтво, якое яно не ціхое і не пакорнае, але і тое, шматкаму коле у вочы і мабыць перамена аснаўных законоў выразіцца у першы чарод у аграніччэньні голасу народнаго прэдстаўніцтва у Думе. Чуваць былі ужо і такіе галасы, каб дэпутатоў назначалі губэрнатары. Адным словам перамена міністроў саўсім не азначае, у Расеі перамены у палітыцы правіцельства, а ешчэ менш можна спадзевацца перамен, асабліва на лепшае, у жыцьці гасударства, а ужо найменш хіба у жыцьці шырокіх масс гаротнаго селянскаго народу, гэта ўсё той самы кругаварот даўно заведзенай машыны.

**Лішні.**

## Праца.

Што творыць багацьце народоў—іх славу, іх здароўе і шчасьця?

Праца.

Праца творыць багацьця, корміць і адзяець людзей, дае ім шчасьця, гонар, сілу і здароўе.

Праца разумная, сьвядомая, перэтварае пустыні у раджайную зямлю, дае сілы слабому, пашану, і гонар ды багацьце беднаму.

Так разумеюць працу людзі вольные, але іначэй народы рабскіе.

Раб, нявольнік, баіцца працы. Ен ня верыць у сваю годнасць чэлавеччу і думае, што найбліжэй стане да свайго пана, калі будзе удаваць таго. А дзеля гэтаго, што рабу найболей кідаецца у вочы, панскае гуляшчае жыцьцё, ён і стараецца у першы чарод патураць яму ў гэтым.

Чэлавек раб, рабскай душы ненавідзіць працы, чэлавек вольны шукае яе.

Чэлавек рабскай душы працуе толькі з мусу, чэлавек вольнай душы працуе са сваей ахвоты, ставячы ей далёкіе і вялікіе мэты.

Розніца паміж чэлавекам вольным і рабом тая, што першы шукае сабе працы,—другі баіцца яе.

Лепшые, здаровые душой, людзі даўно ужо звярнулі на гэта увагу, але хворые рабствам людзі гэтаго не бачуць і не разумеюць.

А іх так многа у нас.

Многа людзей з рабскай душой і мозгам, каторые баяцца працы, стыдаюцца яе!

У нас кожны хто адарваўся ад плуга і касы, стараецца адхрысціцца ад працы, ад свайго сваяцтва с касой і плугам, с фізычнай працай.

І с кожным годам у нашай старонцы робіцца усё болей людзей, як іх добра назваў А. Зрэбны—«пэркалёвенкіх», тандэтных, з рабскімі душонкамі, каторых не стаць на вольные думы, на незалежнае думаньне, але затое умеюць яны поўзаць і лашчыцца да тых, хто у руках мае бізун і кусаць тых, хто не мае зубоў.

Кожны з гэткіх „пэркалёвенькіх“ лічыць за найбольшую ганьбу працаваць рукамі, бо гэта „мужыцкая“ праца, а ён—„пэркалёвенькі“. Яму стыдна дакрануцца цяжкой, здаровай працы!

Ашукаць, абакрасьці, аграбіць, зарабіць юдавы срэбнікі даносам, подласцю «пэркалёвенькіе» заўсёды гатовы, бо гэта... не цяжкая праца!..

„Пэркалёвенькіе“ стыдаюцца ня толькі працы, каторая „змешывае“ іх з «мужыкамі», але баяцца і мовы «мужычай» і староняцца ад сваіх бацькоў, братоў і сясцёр зарабляючых справядлівай працай, у поце чэла, кусок будняго хлеба, бо ён думае, што бытцым ён нешта лепшае за сваіх братоў і бацькоў.

Ен у мелкаце і брузе душы сваей не пытаў сябе ніколі, чым ён лепшы? Што яго адрожнівае ад іх бедных, гаротнікоў працоўных. Ды каб і спытаў душы, не знайшоўбы у ей атказу: яго душа бязплодная пустыня, безпрасьветная цемра... Як той казаў.—«мерзость запустенія»

Каб мог такі раб, раб душой і мозгам, быць шчырым, ён сказаў бы, што прыбліжае яго да рабоваладзецелёў пэркалёвенькая, тандэтная апратка, перароблeная с селянскіх ануч і колькі дзесяткоў слоў «панскай» мовы. Гэта увесь яго духоўны багаж.

На колькі дзесятках дрэнна выгаварываных „панскіх“ слоў апіраецца яго „закон і пракокі“.

Браты беларусы! Да каго з вас не прырасло ешчэ ярмо рабства, змагайцеся з гэтай страшэннай рабскай хваробай, боязьню працы.

Шырця, дзе можэця думку, што ніякая праца не ганьбіць чэлавека. калі яна разумная і чэсная, а наадварот паднімае яго матэрьяльнае і моральнае палажэньне.

Вызваляйця братоў сваіх з рабства душы і сейця здаровае зярно у душах, асабліва моладзі. Кажыця усім і усюды, што праца дае праўдзівае шчасьця чэлавеку і што праз працу здабываецца усё на сьвеці, пачынаючы куском хлеба і канчаючы ўсесьветнай славай.

Праца вольнаго чэлавека не павінна быць, працай несьвядомай, быдлячай. Не, чэлавек вольны душой, павінен ведаць нашто і дзеля чаго ён працуе. Павінен кідаць шырокіе горызонты мысьлю сваей і старацца, каб праца была для ўсіх людзей, не рабскай і не скацінной, а чэлавечай вольнай і сьвядомай.

**Юры Верэшчака.**

## Мова ці гутарка.

Калі я прачытаў у № 5 „Н.Н.“ корэспандэнцію я-ця «Argusa» аб тым, як у Піншчыне «пэркалёвенкіе» беларусы даводзяць што наша мова ня мова (язык), а толь-

# Апаведаньне аб іконніку і залатару,

### людзях мудрых і красамоуных, кнігалюбцам нейкім дзеля славы Божай ды размножэньня дабра посполітаго выкладзенае.

Дасюль ешчэ людзі дасьведчэные і сталые, а памяцьцю цьвёрдые, тые часы у істнаваньні слаўнаго места Віленскаго, зайздруючы згадываюць, калі мыто солянічае на соль простую і ледаватую у два-кроць паменшэно было. Тады ж мешчане віленскіе, з ласкі Яго Каралеўскай Міласьці і прывілей атрымалі, каб тры дні што год перэд сьвятам Нараджэньня Ісуса Хрыста мёд варыць вольна, ні капшчызны, ані васковага да скарбу ня плоцячы

Водлуг гэтаго у Вільні за-звычай стала гадзіну-другую у бясёдзе за келіхам мёду хатняго сцерці. Так сама і залатар Антон Корж, майстар скрозь паважаны, да крамы сваей, на Нямецкай вуліцы збудаванай, часам таго або іншаго са знаёмых запрашаў, каб вечэр зімовы прыстойна у двох скаратаць. Гэткім чынам і у дзень сьвятой Харыціны, каралевы Літоўскай, на покуцьці крамы залатарскай госць, Раман Якубовіч, чэлавек добры і рахманы, за карцом поўным ў-шчэрць. сядзеў

Ешчэ ў моладасьці ўзяўся ён постаці Пана Бога, Яго Прачыстае Маткі і рожных сьвятых вучыцца маляваць. фарбы кволые на дашчэчках кляновых, гладка выструганых і крэйдай загрунтаваных, з малітвай у сэрцы накладаючы. Пяць год яму вучнём давялося быць ды два гады—падмайстрам; а як тэрмін гэты скончыўся, тады Якубовіч, звычай спаўняючы, са старшай дачкой гаспадара свайго, Агатай, жаніўся і, званьня майстра такім парадкам справядліва дайшоўшы, ўсягды цяпер зарабатак меў. Уважаючы на гэта, нават і пан Корж яго да сябе запрашаў, хоць, ведама іконнік залатару раўнёй быць ня можэ і так сама ад яго рожніцца, як, прымерам кажучы, фарба трохграшовая ад золата угорскаго, у агню пяць разоў ачышчэннаго. Але Корж, крамар заможны і паважаны, на сьвеці не замала пажыўшы і шмат чаго зьведаўшы, людзямі ніколі не пагарджаў, гонару свайго, аднак, ні ў чым не зменшаючы Так і цяпер ён, мёд цёмна-бурштыновы смакуючы, словы госьця свайго уважліва слухаў.

Чуткі да мяне дайшлі,—гэтак прамаўляў іконнік Раман Якубовіч, — бытцым Сальватор Роза, майстар умелы, а у працы рупны і здольны, да нашаго краю з зямлі Італійскай прыехаўшы, абразы на мурах цэрквоў полацкіх з вучнямі сваімі малюе, старыну у малеваньні гэтым рухаючы, а навіны уводзячы. Дзеля таго абразы тые ад даўнейшых шмат чым рожняцца, і гэтае людзям у старыне цьвёрдым, а да цэрквы Божай прыхільным сталося вельмі не да спадобы

Ды ешчэ кажуць, бытцым італіец, той аб красе толькі дбаючы, а на збаўленьне душы сваёй забыўшыся паганскіх багоў і шмат чаго іншаго малюе. аб чым іконніку добраму лепш нават і ня думаці. Нічога гэтаго у жоднаго з майстроў часу стараго, а нам у прыклад стаўшаго, пабачыць ня можна. Найгорш жэ тое, што іконнікі полацкіе звычаю рускаго, а у працы здольные і дасьведчэные, навіны гэтые перэймаюць ды да таго ж і людзей усякіх, нават роду посполітаго, а так сама і рэкі, бары і лугі і шмат чаго іншаго малююць, і час і працу сваю праз усё гэтае марне трацячы. Бо, здаецца, кожны зразумець можэ, што сьвятая Ікона Пана Бога, хаця б і зусім неўдала зробленая, бязмерна больш варта, чым са пся якога небудзь малюнак найлепшы. Але майстры тые на гэта не уважаюць, а таму іконапісь прыстойная і да старасьвецхіх звычаёў прыхільная, у Полацку пад'упала, праклятым недаверкам на радасць, а ўсім людзям добрым на жаль і горэ вялікае.

Тады, бачыўшы, што іконнік гутарку сваю ужо скончыў, пан Корж карэц з мёдам на бок пасунуў і, неспешаючыся, пачаў гаварыць:

